Комуністычная партыя (большэв'коў) Беларусі

Пролетарыі ўсіх краін, злучайцеся!

# ЗВЯЗДА

Орган ЦК і МК КП(б)Б, ЦВК і СНК БССР

№ 2[illegible] (514[illegible])
СТУДЗЕНЬ
26
СУБОТА
1935 г.
год выдання XVII

# УРАДАВАЕ ПАВЕДАМЛЕННЕ

**25 студзеня ў 14 гадзін 30 мін. памёр ад склероза сэрца першы намеснік старшыні Совета Народных Камісараў Саюза ССР і Совета працы і абароны, старшыня Камісіі Совецкага Кантроля, член палітбюро ЦК ВКП(б) тав. ВАЛЕР'ЯН ВЛАДЗІМІРАВІЧ КУЙБЫШЭЎ.**

## АД ЦЭНТРАЛЬНАГА КАМІТЭТА УСЕСАЮЗНАЙ КОМУНІСТЫЧНАЙ ПАРТЫІ (большэвікоў)

ЦК ВКП(большэвікоў) З ВЯЛІКІМ ЖАЛЕМ ПАВЕДАМЛЯЕ ПАРТЫЮ, РАБОЧЫ КЛАС, УСІХ ПРАЦОЎНЫХ НАШАЙ КРАІНЫ І ЎСЯГО СВЕТУ, ШТО 25 СТУДЗЕНЯ 1935 ГОДА Ў 14 ГАДЗІН 30 МІН. ПАМЕР АД СКЛЕРОЗА СЭРЦА ЧЛЕН ПАЛІТБЮРО ЦК ВКП(б), НАМЕСНІК СТАРШЫНІ СОЎНАРКОМА СССР І СТАРШЫНЯ КАМІСІІ СОВЕЦКАГА КАНТРОЛЯ ПРЫ СОЎНАРКОМЕ СССР ТАВ. **ВАЛЕР'ЯН ВЛАДЗІМІРАВІЧ КУЙБЫШЭЎ.**

ТАВ. **КУЙБЫШЭЎ** ПАМЁР НА БАЯВЫМ ПАСТУ, ПРАДАЎЖАЮЧЫ ВЯЛІКУЮ ДЗЯРЖАЎНУЮ І ПАРТЫЙНУЮ НАПРУЖАНУЮ РАБОТУ, АЖ ДА АПОШНЯГА МОМАНТУ СВАЙГО ЖЫЦЦЯ.

ТАВ. **КУЙБЫШЭЎ** БЫЎ УЗОРАМ ПРОЛЕТАРСКАГА РЭВОЛЮЦЫЯНЕРА, ПАСЛЯДОЎНАГА ЛЕНІНЦА, НЕПРЫМІРЫМАГА ДА ВОРАГАЎ ПАРТЫІ І РАБОЧАГА КЛАСА І САМААДДАНАГА БАРАЦЬБІТА ЗА СПРАВУ КОМУНІЗМА.

ЯГО РЭВОЛЮЦЫЙНАЯ ДЗЕЙНАСЦЬ ПАЧЫНАЕЦЦА Ў ПЕРЫЯД ПЕРШАЙ РУСКАЙ РЭВОЛЮЦЫІ. ЗА ГАДЫ СВАЕЙ БАЯВОЙ БОЛЬШЭВІЦКАЙ РАБОТЫ ТАВ. **КУЙБЫШЭЎ** ПРАЙШОЎ ПРАЗ ЦАРСКІЯ ТУРМЫ І ССЫЛКІ, ЯК САМААДДАНЫ БАЕЦ ЛЕНІНСКАЙ ПАРТЫІ.

У ГАДЫ ГРАМАДЗЯНСКАЙ ВАЙНЫ ТАВ. **КУЙБЫШЭЎ** З'ЯЎЛЯЕЦЦА АДНЫМ З ВІДНЕЙШЫХ ПАЛІТЫЧНЫХ КІРАЎНІКОЎ ЧЫРВОНАЙ АРМІІ.

БУЙНЕЙШЫ АРГАНІЗАТАР І КІРАЎНІК НАШАГА ДЗЯРЖАЎНАГА І ГАСПАДАРЧАГА БУДАЎНІЦТВА, ТАВ. **КУЙБЫШЭЎ** АДДАВАЎ УСЕ СВАЕ СІЛЫ СПРАВЕ СОЦЫЯЛІЗМА.

БЯЗМЕЖНАЯ АДДАНАСЦЬ ПАРТЫІ, САМААХВЯРНАЯ, НЯСТОМНАЯ РАБОТА НА КАРЫСЦЬ ПРАЦОЎНЫХ ВАЛЕР'ЯНА ВЛАДЗІМІРАВІЧА **КУЙБЫШЭВА** БУДУЦЬ СЛУЖЫЦЬ ПРЫКЛАДАМ ДЛЯ МІЛЬЕНАЎ ПРОЛЕТАРЫЯЎ І ПРАЦОЎНЫХ У ІХ ВЯЛІКАЙ БАРАЦЬБЕ ЗА ТАРЖАСТВО КОМУНІЗМА.

*ЦЭНТРАЛЬНЫ КАМІТЭТ УСЕСАЮЗНАЙ КОМУНІСТЫЧНАЙ ПАРТЫІ (большэвікоў)*

## ЦЭНТРАЛЬНАМУ КАМІТЭТУ УСЕСАЮЗНАЙ КОМУНІСТЫЧНАЙ ПАРТЫІ (большэвікоў)

Выканаўчы Камітэт Комуністычнага Інтэрнацыянала разам з Усесаюзнай Комуністычнай партыяй (большэвікоў), з усімі працоўнымі СССР, разам з усім міжнародным пролетарыятам глыбока сумуе па повадy смерці

**тав. Валер'яна Владзіміравіча КУЙБЫШЭВА,**

члена палітбюро ЦК ВКП(б), паследаваўшай 25 студзеня 1935 года ў горадзе Маскве.

ВЫКАНАЎЧЫ КАМІТЭТ КОМУНІСТЫЧНАГА ІНТЭРНАЦЫЯНАЛА.



Наша партыя панесла вялікую страту: 25 студзеня 1935 года раптоўна памёр ад склероза сэрца тав. **ВАЛЕР'ЯН ВЛАДЗІМІРАВІЧ КУЙБЫШЭЎ.**

Валер'ян Владзіміравіч Куйбышэў з юнацкіх год змагаўся пад вялікім сцягам Леніна.

Ён упарта, не пакладаючы рук, працаваў і ў большэвіцкім падполлі, і на франтах грамадзянскай вайны, і на важнейшых участках соцыялістычнага будаўніцтва.

Ужо ў 1905 годзе тав. Куйбышэў у Пецербургу актыўна ўдзельнічае ў рэвалюцыі, як большэвік. Ён працуе затым у большэвіцкай арганізацыі Сібіры, як партыец-прафесіянал; у перапынках паміж неаднаразовымі ссылкамі і турэмнымі зняволеннямі ён вядзе кіруючую партыйную работу і ў большэвіцкай ар-

## Ад Народнага Камісарыята Абароны

Народны Камісарыят Абароны Саюза ССР з глыбокім жалем паведамляе рабоча-сялянскую Чырвоную армію аб заўчаснай смерці члена палітбюро ЦК ВКП(б), намесніка старшыні Совета Народных Камісараў Саюза ССР і старшыні Камісіі Совецкага Кантроля

**Валер'яна Владзіміравіча КУЙБЫШЭВА,**

старэйшага і адданейшага большэвіка-ленінца, аднаго з талентлівейшых кіраўнікоў совецкай дзяржавы і блізкага саратніка тав. Сталіна, аднаго з найбольш выдатных арганізатараў перамог Чырвонай арміі на франтах грамадзянскай вайны і баявой магутнасці сучаснай Чырвонай арміі.

КАМІСІЯ СОВЕЦКАГА КАНТРОЛЯ ПРЫ СНК СССР З ГЛЫБОКІМ ЖАЛЕМ ПАВЕДАМЛЯЕ АБ СМЕРЦІ АДНАГО З ЛЕПШЫХ СЫНОЎ БОЛЬШЭВІЦКАЙ ПАРТЫІ, НЕПАХІСНАГА І БЯССТРАШНАГА БАРАЦЬБІТА ЗА СПРАВУ ЛЕНІНА-СТАЛІНА, ЧЛЕНА ПАЛІТБЮРО ЦК ВКП(б), НАМЕСНІКА СТАРШЫНІ СНК САЮЗА І СТАРШЫНІ КАМІСІІ СОВЕЦКАГА КАНТРОЛЯ, ТАВАРЫША, ДРУГА І КІРАЎНІКА

**Валер'яна Владзіміравіча КУЙБЫШЭВА.**

Цэнтральная камісія ВКП(б) па чыстцы патрасена нечаканай заўчаснай смерцю дарагога таварыша

**В. В. КУЙБЫШЭВА,**

члена Цэнтральнай камісіі ВКП(б) па чыстцы.

Прэзідыум усесаюзнага Таварыства старых большэвікоў выказвае свой глыбокі смутак аб утраце аднаго з старых падпольшчыкаў, адданейшага пролетарскай рэволюцыі партыйца

**тав. Валер'яна Владзіміравіча КУЙБЫШЭВА.**

ПРЭЗІДЫУМ ТАВАРЫСТВА.

## ЦК ВКП(б)—тав. СТАЛІНУ
## Старшыні Соўнаркома СССР тав. МОЛАТАВУ

ЦК КП(б)Б, ЦВК і СНК БССР і Беларуская дэлегацыя на VII усесаюзны з'езд советаў выказваюць глыбокі смутак па повадy смерці члена палітбюро ЦК ВКП(б), намесніка старшыні Соўнаркома Саюза ССР

**Валер'яна Владзіміравіча Куйбышэва,**

У асобе тав. Куйбышэва наша партыя, рабочы клас і Краіна советаў страцілі стойкага большэвіка-рэволюцыянера, аднаго з буйнейшых дзеячоў і кіраўнікоў партыі і совецкай дзяржавы, вернага саратніка і друга тав. Сталіна.

У гэты цяжкі момант нечаканай утраты мы заяўляем ЦК ВКП(б) і табе, тав СТАЛІН, што рабочыя, калгаснікі і працоўныя масы Совецкай Беларусі яшчэ цясней згуртуюцца вакол партыі

